Галоўная мэта ў рабоце з сям'ёй — двухбаковае супрацоўніцтва, сумесны пошук шляхоў і сродкаў эфектыўнага выхавання дзяцей у сям'і, у школе, у грамадстве. Вельмі важна, каб бацькі на аснове ведаў, уменняў, навыкаў і вопыту стваралі камфортнае асяроддзе для развіцця і дапамагалі дзецям у іх сталенні.

# Супрацоўніцтва сям'і і школы

## Традыцыйныя і інавацыйныя формы і метады работы з сям'ёй для эфектыўнага ўзаемадзеяння з бацькоўскай грамадскасцю

Вядучы прынцып, на якім грунтуецца сямейнае выхаванне, — разумная і дзейсная любоў да дзяцей. Звычайна ўзаемадзеянне школы і бацькоў рэалізуецца праз бацькоўскія ўніверсітэты, традыцыйныя бацькоўскія сходы, сустрэчы, лекцыі, сумесныя святы, паходы, экскурсіі. Наш калектыў працуе над тым, каб большасць бацькоў уключалася ў вырашэнне самых розных пытанняў, якія тычацца сям'і і школы: дзеці і школа, дзеці і здароўе, дзеці і праца, дзеці і соцыум, сям'я і дзеці, дзеці і вольны час, дзеці і прафесія, дзеці і інтэрнэт.

У Нёманскай сярэдняй школе імя І. Д. Гурскага ў гадавым плане работы ўлічаны асноўныя складнікі, тэмы па арганізацыі актыўнага супрацоўніцтва з бацькамі, сям'ёй: «Стаць чалавекам» — класныя гадзіны, выхаванне прыкладам бацькоў; «Школа сямейнай духоўнай культуры» — сустрэчы з айцом Аляксеем, настаяцелем Свята-Мікалаеўскай царквы в. Магільна; «Роля школы, сям'і і грамадскіх арганізацый у фарміраванні асобы дзіцяці» — бацькоўскія сходы; «Дзеці і соцыум» — школьныя праекты.

У шосты школьны дзень, калі бацькі маюць вольны час, ладзяцца конкурс творчых работ «Мая сям'я — маё натхненне» ( А. Кушнер, 8–10 класы), круглы стол «Сямейнае шчасце: у чым яно праяўляецца?» (Л. Собаль, 5–9 класы), гадзіна



**Любоў Анатольеўна Собаль,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі ДУА «Нёманская сярэдняя школа імя І. Д. Гурскага» Уздзенскага раёна. Педагагічны стаж — 43 гады.

паэзіі «Мамін вобраз у россыпу кветак» (А. Зомер, 5–9 класы), конкурс малюнкаў «Мая сям'я: тата, мама, я» (А. Шкуратава, 1–4 класы), квэст-гульня «Маміна прафесія» (Т. Трухан, 1–4 класы), гутарка «Традыцыі маёй сям'і» (В. Стахно, 8–10 класы), падарожжа па краіне здароўя «Бацькоўскія сакрэты правільнага харчавання» (А. Каладзінская, 1— 4 класы), спартландыя з удзелам бацькоў «Быць здаровым — мод-

ЧИТАЙТЕ В СВЕЖЕМ НОМЕРЕ «ОМ»